ность усваивать текстовый материал с учетом его взаимосвязей. Студент сам избирает пути прочтения фрагментов в текстовом пространстве.

Главным качеством Интернета является наличие огромного количества текстовой информации на разных языках. Конечно, такая информация не предназначена для применения в качестве учебного материала. Студенты так или иначе постоянно обращаются к этой технологии при поиске необходимой информации. Однако качество этого поиска напрямую зависит от умения работать с информационными технологиями и анализировать семантическую сторону информации.

Обеспеченность студентов учреждения высшего образования компьютерной техникой и доступом в Интернет, высокий уровень компьютерной грамотности, мотивация работы с информационными технологиями создают предпосылки для эффективной интеграции информационных технологий в образовательный процесс и способствуют повышению эффективности и качества подготовки специалистов.

1. *Даливеля, О. В.* Опыт внедрения информационных коммуникационных технологий в систему специального образования Республики Беларусь / О. В. Даливеля, В. Э. Гаманович // Спецыяльная адукацыя. – 2011. – № 2. – С. 8–12.

2. *Петренко, Б. В.* Инновационные технологии преподавания технических дисциплин / Б. В. Петренко, С. В. Маланухина // Белорусская культура в условиях глобализации. – Минск : БГУКИ, 2011. – Т. 1. – С. 382–384.

3. *Смирнова, А. С.* Трудности обучения студентов, связанные со структурированием информации / А. С. Смирнова // Alma mater. Вест. высш. шк. – 2013. – № 11. – С. 112–114.

**Н. В. Петухова,** *выкладчык кафедры этналогii i фальклору, кандыдат педагагiчных навук*

## ПРАБЛЕМЫ ЗАСВАЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПЕЎЧАЙ ТРАДЫЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ СТУДЭНЦКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

У дзейнасці студэнцкіх фальклорных калектываў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў вядучае месца адводзіцца не толькі раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучванню і выкананню разнастайных жанраў фальклору, у прыватнасці народных песень, гульняў, танцаў і карагодаў, але і мясцовых традыцый іх увасаблення. Менавіта ўвага да мясцовых традыцый з’яўляецца асноўным кірункам творчай дзейнасці выкладчыкаў кафедры: Т. А. Пладуновай, В. В. Калацэя, Э. В. Шчадрыной і інш., якія адзначаюць, што праблемы засваення дадзеных традыцый звязаны з імкненнем увасобіць у выкананні найбольш характэрныя рысы, уласцівыя пэўнаму рэгіёну.

Па-першае, гэта ўсведамленне дыялектных асаблівасцей народнай песні не як скажэння беларускай літаратурнай мовы, а як крыніцы жывой гаворкі, якая з’яўляецца інтанацыйнай базай для ўзнікнення меладычнага багацця беларускай песеннасці. Залежнасць песеннага меласу ад дыялектных асаблівасцей мясцовай гаворкі настолькі вялікая, што без пільнай увагі да пэўнага дыялекту авалоданне лакальнай манерай спеваў немагчыма. Слова, прамоўленае ў дыялектнай форме з уласцівай яму інтанацыяй, становіцца асновай для фарміравання спеўнай пазіцыі. Пры гэтым варта дамагацца абсалютнай дакладнасці вымаўлення. Нязменным матэрыялам з’яўляюцца казкі, скорагаворкі, лічылкі, дражнілкі і інш., якія служаць асновай для максімальна дакладнага прайгравання іх фанетычных асаблівасцей.

Па-другое, гэта вывучэнне музычна-стылявых заканамернасцей, уласцівых дадзенаму рэгіёну. Лакальны характар маюць тэмбравыя характарыстыкі гуку, ладавыя асаблівасці, поліpытмія музычнай тканіны, розныя спецыфічныя выканальніцкія прыёмы (вібрата, мелізмы, глісанда і інш.), асаблівасці харэаграфіі і г. д. Варыянты аднаго і таго ж напеву, запісаныя ў розных вёсках, могуць даць уяўленне пра яго тыповыя заканамернасці, пры гэтым кожны варыянт захоўвае сваю каштоўнасць і ўнікальнасць. Праслухоўванне і аналіз усіх магчымых варыянтаў узбагачае слыхавы досвед удзельнікаў фальклорных калектываў і дазваляе паспяхова выкарыстоўваць яго ў выканальніцкай практыцы.

Акрамя вышэй акрэсленых праблем практыка студэнцкіх фальклорных калектываў ставіць яшчэ адну: спасціжэнне народнай песні праз яе выкананне. Выканальніцтва варта разглядаць як неабходную частку жыцця народнай песні, якая ўяўляе сабой бесперапынны працэс – ад аднаго выканання да наступ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага. Менавіта ў момант выканання прыводзіцца ў дзеянне сам механізм традыцыйнасці: «выкананне – ўспрыманне – усведамленне – новае выкананне» і г. д. Пры гэтым народныя песні, захоўваючы свае ўстойлівыя канструктыўныя і змястоўныя элементы, аказваюцца не застылымі раз і назаўсёды «выкапнямі», а рухомымі, здольнымі да развіцця і напаўнення з кожнага новага выканання.

Надзвычай важна ўлічваць у рабоце студэнцкага фальклорнага калектыву варыятыўнасць выканання народнай песні, якая прадстаўляе сабой форму функцыянавання фальклорных узораў, іх імправізацыйнае пераўтварэнне, абумоўленае арыентацыяй на традыцыйны ўзор. Народныя майстры спеваў кожны раз нанава выбудоўваюць музычную тканіну на аснове галоўнага напеву. Саліст-выканаўца можа дэманстраваць мноства розных варыянтаў асноўнага меладычнага контуру. У ансамблі галасы народных спевакоў свабодна пераплятаюцца паміж сабой, утвараючы кожны раз новае спалучэнне. Дзякуючы гэтаму, гучанне народнай песні пастаянна ўзбагачаецца, і гэтым яе выкананне носьбітамі традыцыі выгадна адрозніваецца ад завучаных па партыях спеваў, якія практыкуюцца ў многіх аматарскіх і прафесійных фальклорных калектывах.

Аднак выкананне фальклорнага калектыву ні ў якім разе не павінна станавіцца толькі сляпым капіраваннем спеваў носьбітаў традыцыі. У многіх выпадках народныя выканаўцы сталага ўзросту аказваюцца здольныя прайграць толькі меладычны контур напеву, без належнага тэмбрава-дынамічнага напаўнення. У такіх выпадках вялікую ўвагу варта звярнуць на словы саміх выканаўцаў, навуковыя публікацыі беларускіх этнамузыколагаў Т. Б. Варфаламеевай, З. Я. Мажэйка, Л. С. Мухарынскай, Т. С. Якіменка, В. М. Яшчанка і інш., якія могуць паведаміць пра тое, як насамрэч павінна гучаць песня, пры якіх абставінах і г. д. Так, згодна з Л. С. Мухарынскай, характар гучання каляндарна-абрадавых песень, якія спяваюцца на вуліцы, істотна адрозніваецца ад сямейна-абрадавых песень, якія спяваюцца ў хаце. Эмацыянальны пасыл, сіла «выкліку» ў «загуканнях вясны», купальскіх, масленічных песнях дае магчымасць пры выкананні вызначыць неабходнасць спеваў ў больш высокай тэсітуры і з вялікай сілай гуку [1, с. 39].

Вывучэнне і аднаўленне народнапесенных традыцый немагчыма без усведамлення асаблівасцей бытавання фальклорных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў у тым ці іншым этнаграфічным кантэксце. Само ўзнікненне народных песень адбывалася ў сувязі з пэўнай абрадавай ці побытавай практыкай. Яны суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека, найважнейшыя падзеі яго жыцця (нараджэнне, шлюб, смерць), дапамагалі ў выхаванні дзяцей, транслюючы новым пакаленням жыццёвую мудрасць, веды і вопыт. Інакш кажучы, былі непарыўна звязаны з традыцыйным кантэкстам, існавалі ў замацаваных мясцовымі традыцыямі сітуацыях. Асабліва гэта тычыцца выканання абрадавых твораў.

На сучасным этапе мясцовыя традыцыі нярэдка стаяць на мяжы поўнага згасання, таму праблема вывучэння і аднаўлення перарастае ў праблему рэканструкцыі той ці іншай фальклорнай з'явы, таго ці іншага абраду. Пры гэтым выкананне народнай песні, гульні, танца альбо карагода пры пэўных умовах уяўляе сабой абрад, мэтай якога з'яўляецца ўстанаўленне сувязей з навакольным светам, уздзеянне на прыродныя стыхіі (рэканструкцыя каляндарнага абраду) або атрыманне падтрымкі заступнікаў роду (рэканструкцыя сямейна-родавага абраду) і г. д. Трэба падкрэсліць, што адарваная ад кантэксту абрадавая песня гучыць зусім інакш, чым у сітуацыі яе спрадвечнага існавання. Нават у выкананні саміх носьбітаў традыцыі, якія выйшлі на сцэну, могуць губляцца характэрныя асаблівасці тэмбру, ладу, рытмікі, у выніку чаго песня можа набыць неўласцівы ёй лірычны характар.

У выкананні студэнцкага фальклорнага калектыву абрадавая песня можа прагучаць больш або менш натуральна падчас мадэлявання абрадавай сітуацыі. Мэтазгодна выкарыстоўваць такія святы каляндарнага цыкла, як Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'я, Троіца, Купалле, Жніво, якія могуць набыць характар ўсеагульнага народнага гуляння. Пры такім мадэляванні адбываецца паглыбленне ўдзельнікаў калектыву ў сферу абраду, а іх выкананне атрымлівае эмацыянальную афарбоўку, што забяспечвае неабходны характар гучання. Вясну «гукаюць спеўнымі купкамі "з гары на гару"; з велікоднымі і юраўскімі абыходнымі крокамі крочаць ад хаты да хаты; купальскія спяваюць уначы і па прызначэнні (як вянкі завіваюць, як абыходзяць жыта, як запальваюць вогнішча і водзяць карагоды, гуляюць і дражняцца адзін аднаго, як раніцай сустракаюць сонца)» [2, с. 106]. Шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульняў, танцаў разлічаны на свабоднае да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лучэнне ўсіх жадаючых, што дазваляе лёгка стварыць незабыўную атмасферу народнай эстэтыкі. Удзельнікам фальклорнага калектыву гэта дае магчымасць уключыцца ў абрадавую сітуацыю, перажыць яе, адчуць сябе не толькі пераемнікам, але і носьбітам народнапесенных традыцый.

Працэс пераемнасці народнапесенных традыцый у фальклорных калектывах – гэта працэс сатворчасці асоб, у якім адзінства агульнага гучання не дапускае ператварэння характэрнай асабістай манеры ў завучаную партыю, а дасягненне высокага ўзроўню індывідуальнага майстэрства суправаджаецца выпрацоўкай спецыфічнага адчування ансамбля, заснаванага не толькі на чысціні ладу. Пачуццё ансамбля становіцца падставай для больш складанай музычна-псіхалагічнай каардынацыі спевакоў, своеасаблівай выканальніцкай камплементарнасці, якая праяўляецца на розных узроўнях. Гэта датычыцца тэмбравага дапасавання галасоў, якое дапускае спалучэнне галасоў рознай афарбоўкі, ступені іх варыяцыйнай і імправізацыйнай рухомасці, імкнення дакладна рэалізаваць інтанацыйна-фактурны патэнцыял напеву.

Трэба асобна падкрэсліць, што ўсе разгледжаныя вышэй вакальна-тэхнічныя навыкі выканання народнай песні неабходна фарміраваць комплексна, ва ўзаемасувязі. Відавочна, што аб дакладным засваенні беларускай спеўнай традыцыі можна гаварыць толькі ў тым выпадку, калі ўдзельнікі фальклорнага калектыву добра валодаюць песенным дыялектам традыцыі, характарам вымаўлення тэксту, сістэмай пеўчай артыкуляцыі, свабодна выкарыстоўваюць падчас спеваў шматлікія элементы музычнай сістэмы дадзенага лакальнага стылю, валодаюць тыпавымі для дадзенай традыцыі тэмбравымі характарыстыкамі гуку, якія ўзнікаюць у выніку каардынацыі індывідуальных асаблівасцей голасу з гукавым узорам мясцовага вакальнага стылю.

1. *Мухаринская, Л. С.* Белорусская народная песня: историческое развитие : очерки / Л. С. Мухаринская. – Минск : Наука и техника, 1977. – 216 с.

2. *Пладунова, Т. А.* Этнафанія: стылі выканання і вакальная практыка ў аматарскім фальклорным калектыве / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання. Вып. 2 : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. (19–20 крас. 2006 г., г.п. Акцябрскі) ; аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2006. – С. 101–108.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ